**Пушкін І.А., Пушкін Я.І.**

# ФРАНТАВЫ ДЗЁННІК САЛДАТА

Вялікае значэнне для ўшанавання памяці аб Вялікай Айчыннай вайне маюць дакументы тых часоў. У тым ліку лісты і запісы франтавікоў, у якіх адлюстраваны штодзённы клопат салдата – вызваліцеля.

У 2003 г. у г. Шклове памёр ветэран працы і Вялікай Айчыннай вайны Мацюшэўскі Рыгор Фаміч. Сын, згодна тэстаменту бацькі, перадаў у музей гісторыі горада Магілёва яго дакументальны і фота архівы, баявыя ўзнагароды і дзённік за 1945 г.

Рыгор Фаміч Мацюшэўскі нарадзіўся 1.08.1920 г. у вёсцы Любатынь Талачынскага раёну Віцебскай вобласці (Беларусь). Паходзіў з заможнай і шматдзетнай сям'і. У 1932 г. яго бацьку – Фаму Фадзеевіча Мацюшэўскага, за антысавецкую дзейнасць асудзілі на 10 гадоў. Маці з чатырма дзяцьмі засталася ў БССР. У шаснаццацігадовага падлетка Рыгора атрымалася збегчы з вёскі ў горад – Магілёў, дзе са жніўня 1936 па жнівень 1937 г. вучыўся ў школе "Стройуч". Затым ён на працягу двух годоў працаваў цесляром-сталяром у Харкаве (Украіна). Як пачалася Другая сусветная вайна (восень 1939 г.) вярнуўся на радзіму, працаваў у калгасе імя Калініна Талачынскага раёна. Са студзеня 1940 г. па чэрвень 1941 гг. – курсант, а затым трактарыст Талачынскай МТС. У перыяд гітлераўскай акупацыі Беларусі жыў і займаўся земляробствам у в. Любатынь, меў самаробны млын.

8.06.1944 г. быў мабілізаваны ў Чырвоную Армію. Да 9.05.1945 г., спачатку радавы, а затым яфрэйтар (сапёр) 142-га асобнага мотаінжынернага ордэна Аляксандра Неўскага батальёна 33-й асобнай мотаінжынернй Магілёўскай брыгады. Удзельнічаў у вызваленні Магілёўшчыны, Мінска, Гродна, Беластока, Варшавы, Усходне-Памеранскай і Берлінскай аперацыях. У баях за вызваленне Польшчы быў паранены ў абедзьве нагі. Дэмабілізаваны ў маі 1946 г. сяржантам, камандзірам аддзялення.

Але ён быў не проста салдатам, удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны. Звернемся да цікавага дакумента, які захоўваецца ў Музеі гісторыі г. Магілёва: "*Вайсковая часть. Полевая почта 41703. Справка. Дана младшему сержанту Матюшевскому Григорию Фомичу в том, что он действительно выполнял обязанности фатографа по совместительству с несением воинской службы при В/ч п.п. 41703. Что и удостоверяется. Камандир В/ч п.п. 41703 подполковник Малыгин. Подпись, печать*" [3].



Репозиторий ВГУ

Рыгор Фаміч быў адначасова ў батальёне фатографам і зафіксаваў шмат эпізодаў з ваеннага жыцця аднапалчан. Багаты і цікавы ваенны фотаархіў Р.Ф. Мацюшэўскага дэманстраваўся музеем гісторыі г. Магілёва ў 2005 г. на яго персанальнай пасмяротнай выставе “Вайна вачыма аднаго салдата”.

Найбольшую цікавасць у даследчыка выклікае дзённік Рыгора Мацюшэўскага [2], які ён вёў на працягу 1945 г. Гэта невялічкая кніжка-блакнот (штодзённік), памерам 10,5 x 7 см, надрукаваная на нямецкай мове: “Kalender für 1945”. Штодзённік – трафейны здабытак Р. Мацюшэўскага. Першы запіс ён зрабіў напрыканцы студзеня. Раней не мог, бо ўдзельнічаў у баях за вызваленне ад гітлераўцаў г. Варшавы (вызвалена 17.01.1945 года).

Вашай ўвазе прапануюцца некаторыя запісы салдата-франтавіка (публікуюцца ўпершыню, захаваны аўтарскі правапіс і стыль). У пэўныя дні іх няма. Таму, што з-за ўдзелу ў баявых дзеяннях не хапала часу. Нават у маленькіх нататках салдата бачна спалучэнне гераізму (удзел у баях, раненне), трагічнага (гібель аднапалчан) і штодзённага клопату аб родных.

“*29.01.1945 г. Ночью прибыли в мястечка Герцегсвальдэ в раёне городав райхоу, и любштадт* (сучасны польскі горад – Мілакава) *и ночью уходили из этого населен. пункта в Райхау.*

*30.01. С утра прыбыли к передавой в мястечко вечером в 5 часов. Ранен и отравлен в сан. часть.*

*6.02. Прыбыли в сан. взвод отправил посылочку.*

*19.02. Сняли повязку с ран…*

*1.03. Отправил посылочку с сапожн. материалом и ёщё кой чего.*

*8.03. Выписали с санвзвода и направили в свое подразделение для нясення дальнейшей службы и сегодня же прыбыл в свой взвод…*”

Тут трэба дабавіць тое, чаго няма ў дзённіку – 13.04.1945 г. Р.Ф. Мацюшэўскі за праяўленныя доблесць і мужнасць пад час Усходне-Памеранскай аперацыі быў узнагароджаны медалём “За боевые заслуги”. З прадстаўлення да ўзнагароджання: “*В боевых операциях батальона в Восточной Пруссии красноармеец Матюшевский проявил образцовую смелость и отвагу, обладая этими высокими качествами, он увлекал за собой остальных бойцов своего отделения при отражении контратак противника в районе г. Толькемит и Фраузнбург. В боях за советскую Родину был легко ранен 30.01.45 г. под г. Либштадт*”.

Працягваем цытаваць запісы дзённіка [2]:

“*20.03. Выслав посылочку с места где стояли рядом с колбасной мастерской стирка гимнастерки.*

*28.03. Данциг* (сучасны польскі горад – Гданьск) *отправил посылочку мамаши...*

*22.04. Переданы кавалерийскому соединению.*

*27.04. Пошли в наступление с кав. дивизией* (6 гвардзейская кавалерыйская дывізія 3 гвардзейскага кавалерыйскага корпуса 2 Беларускага фронта).

*28.04. Марш и постройка мостов двух.*

*29.04. Марш и постройка моста.*

*30.04. Марш.*

*1.05. Марш.*

*2.05. С утра марш и соединились с союзными войсками на реке Эльба.*

*3.05. Постройка пристани ночью.*

*5.05. Постройка пристани на стороне союзьников.*

*6.05. Выехали с мястечка где соединились с союзниками и марш на Штэтин* (Шчэцін – горад на паўночным захадзе сучаснай Польшчы).

*8.05. Прибыли в Штетин и расположились в разборных фрицивских бараках.*

*9.05. Обед в честь праздника победы и смерть мл. л. Веровкина.*

*12.05. Проверка на мины улиц г. Штетина и после обеда за 2 растегнутых пуговицы 3 суток*”.

Адбыўшы трое сутак за знешні выгляд “не по уставу”, 16.05.1945 г. Р.Ф. Мацюшэўскі за выкананне заданняў камандавання падчас Берлінскай аперацыі і праяўленную пры гэтым мужнасць, атрымаў узнагароду – медаль “За отвагу”. З прадстаўлення да ўзнагароджання: “*В ночь с 28 на 29 апреля 1945 г. красноармеец Матюшевский с двумя бойцами произвёл инженерную разведку реки Хайель в месте проведения переправы возле хутора Лансеваль. Отважно переправившись на западный берег на плотике из бревён под огнём противника, красноармеец*



Репозиторий БГУ

*Матюшевский детально обследовал берег и выбрал наиболее подходящее место для постройки переправы и устройства подъездов к ней, чем обеспечил своевременное развёртывание работ по постройке переправы 2-й ротой*".

Узгаданая ў дзённіку, сустрэча з саюзнікамі адбылася крыху паўночней ад нямецкага г. Вітэнберга. 28-й гвардзейскі кавалерыйскі полк пад камандаваннем падпалкоўніка М.А. Вісаітава падчас наступлення ў авангардзе 6 гвардзейскай кавалерыйскай дывізіі ва ўзаемадзеянні з танкавымі і артылерыйскімі палкамі прарваў абарону ворага ў раёне горада Шведт (Германія). Напрыканцы дня 2.05.1945 г. полк выйшаў на раку Эльба ў раёне паўночней горада Вітэнберг і ў ліку першых сустрэўся з англа-амерыканскімі войскамі.

"*22.05. Выслав посылочку с шелком.*

*1.06. Прибыли в польский город Бромберг* (сучасны польскі горад – Быдгаш) *в пригород в лесную чащу разбитые воздушной волной бараки.*

*2.06.Стоим на месте.*

*3.06. Троица. Поездка в город на поиски квартир празднество в городе и переезд на новое место стоянки в ляску Яхчица.*

*25.07. Отправил посылочку из Лигница* (сучасны польскі горад – Легніца). *6 м шелку простынь и др.*

*30.07. Видел сон здаетца вытащил зуб плохой и он на подобие какойто чашки.*

*18.08. Работы очень много с отъезжающими снимками в том числе и Иванченка. в 9 часов вечер посьвящение отправке демобилизуемых присутствовал на вечере и я.*

*19.08. Утром провожал Иванченку днем спортивн. соревн. по бригаде и моя фотоснемка их. Вечером кино.*

*1.09. День рождения Антонины Григорьевны Матюшевской моей дочери.*

*11.09. Отправил письмо Казанцаву*".

22.10.1945 года ў жыцці Р. Мацюшэўскага адбылася яшчэ адна падзея. Працытуем дакумент: "*Выписка из приказа 142 Отдельного Мото-Инженерного ордена Александра Невского Батальона № 168 от 22 октября 1945 года г. Гольдберг. За отличное выполнение заданий в борьбе с немецко-фашистскими захватчиками нагрождается подарком от командования 142 Отдельного Мото-Инженерного ордена Александра Невского Батальона ефрейтор Матюшевский Григорий Фомич ФОТО-АППОРАТОМ и увеличительным прибором. Начальник штаба 142 ОМИо АН Бат. Капитан Сысоев. Подпись, печать*" [1].

Апошнія запісы ў дзённіку датуюцца лістападам 1945 г. Пасля заканчэння баявых дзеянняў Рыгор Фаміч разам з байцамі свайго падраздзялення займаўся размініраваннем гарадоў Германіі і Польшчы.

Аналіз дакументаў Р.Ф. Мацюшэўскага ў фондах Музея гісторыі г. Магілёва дазваляе асвятліць тыповыя факты з асабістага і працоўнага жыцця любога салдата-франтавіка, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны: беларус, быў жанаты, меў сына і дзве дачкі; у камсамоле не састаяў, але ў 1963 г. уступіў у КПСС. Сапёр-фатограф на вайне, пасля дэмабілізацыі працаваў трактарыстам, механікам, загадчыкам майстэрні ў розных прадпрыемствах Беларусі і Эстоніі. У маі 1982 г. выйшаў на пенсію і ў лістападзе вярнуўся на радзіму. Пабудаваў двухпавярховы дом з цэглы ў г. Шклове, дзе і жыў да сваёй смерці.

Р.Ф. Мацюшэўскі быў узнагароджаны ордэнам "Отечественной войны II степени", медалямі "За отвагу", "За боевые заслуги", "За освобождение Варшавы", "За победу над Германией", "Ветеран труда" (1980 г.) і 8 юбілейнымі.

Салдатам на вайне было катэгарычна забаронена весці нейкія запісы. Калі іх знаходзілі – маглі аддаць пад трыбунал і жорстка пакараць. Таму, захаваўшыйся франтавы дзённік Р.Ф. Мацюшэўскага, – каштоўная гістарычная крыніца і рарытэтная рэч часоў Вялікай Айчыннай вайны, якая вартая належнага месца ў экспазіцыі любога музея.

Літаратура


1. Выписка из приказа 142 Отдельного Мото-Инженерного ордена Александра Невского Батальона № 168 // Фонды УК "Музей гісторыі горада Магілёва". – МГМ КП 3998.
2. Записная книжка // Фонды УК "Музей гісторыі горада Магілёва". – МГМ КП 3856.
3. Справка младшему сержанту Матюшевскому Григорию Фомичу // Фонды УК "Музей гісторыі горада Магілёва". – МГМ КП 4000.


Репозиторий ВГУ